страну было завезено значительное количество американских аппаратов фирмы «Хайдбринг». Они поступили на оснащение некоторых военно-медицинских учреждений, что в значительной степени облегчило проведение анестезии. Появление новых моделей наркозных аппаратов, основанных на рециркуляции газов и поглощении углекислоты в замкнутых или полузамкнутых системах, позволило заменить инсуфляционный способ интратрахеального наркоза интубационным [2].

Из всего вышесказанного, мы можем сделать вывод о том, что в ходе Великой Отечественной войны анестезиология активно развивалась. Во время войны фактически произошло утверждение анестезиологии как самостоятельной специальности. Предпринятые организационные мероприятия позволили в относительно короткий срок улучшить состояние анестезиологической службы, что внесло огромный вклад в победу советского народа в Великой Отечественной войне.

***Литература***

1. Кохан, Е.П. Роль сосудистой хирургии по опыту Великой Отечественной войны / Е.П. Кохан, С.П. Глянцев, Н.И. Галик, Е.В. Цымбал // Электронный журнал ANGIOLOGIA.ru. – 2010. – № 1. – С. 3-5.

2. Полушин, Ю. С. Анестезия и противошоковая терапия в период второй мировой войны (к 65-летию завершения второй мировой войны) / Ю. С. Полушин // Вестник анестезиологии и реаниматологии. – 2010. – Т. 7, № 3. – С. 59-66.

***Грышко Карына Аляксандраўна***

# ПАРТЫЗАНСКІ І ПАДПОЛЬНЫ РУХ НА ВОРАНАЎШЧЫНЕ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Кафедра сацыяльна-гуманітарных навук

Навуковы кіраўнік – загадчык кафедры сацыяльна-гуманітарных навук, к.г.н., дацэнт, Сіткевіч С.А.

22 чэрвеня 1941 г. пачалася Вялікая Айчынная вайна, самая цяжкая і лютая з усіх, якія калі-небудзь давялося перажыць нашай Радзіме. На Воранаўшчыну вайна прыйшла ужо на другі



Репозиторий ГрГМУ

дзень.У Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнічалі тысячы жыхароў Воранаўскага раёна. Яны змагаліся у складзе Чырвонай Арміі, партызанскіх фарміраванняў і падполля.

У сувязі з хуткім рухам гітлераўскіх войск у першыя дні вайны на акупіраванай тэрыторыі аказалася нямала камандзіраў і байцоў Чырвонай Арміі. Найбольш вострай і рэзультатыўнай формай супраціўлення ў тыле ворага з'яўлялася барацьба партызан. Яна ахапіла ўсе акупіраваныя раёны, прыняла масавы характар. У ёй удзельнічалі ўсе слаі насельніцтва, людзі розных нацыянальнасцей, узростаў і прафесій. Але да пачатку Вялікай Айчыннай вайны партызанскі рух не меў ні гатовых баявых сіл, ні распрацаваных арганізацыйных форм барацьбы. Яны ствараліся ва ўмовах жорсткай барацьбы з ворагам, непасрэдна ў тыле ворага. Таму 29 чэрвеня 1941 г. у дырэктыве ЦК, ВКП(б) і Саўнаркома СССР партыйным і савецкім арганізацыям была пастаўлена задача «ў занятых ворагам раёнах ствараць партызанскія атрады і дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай вайны ўсюды». У выніку ўжо восенню 1941 г. з'явіліся першыя партызанскія групы. Складаліся яны ў асноўным з салдат Чырвонай Арміі, якія не трапілі ў палон ці збеглі з яго, з актывістаў савецкай улады, якія хаваліся ад гітлераўскіх улад. Гэтыя групы былі яшчэ малалікія, слаба ўзброеныя і неарганізаваныя, праяўлялі малую актыўнасць. На пачатку вайны яны не мелі асабліва моцнай падтрымкі і з боку мясцовага насельніцтва. Але гэта быў пачатак доўгай і цяжкай барацьбы.

У гэты час узнікла адна з першых груп, якая дзейнічала на тэрыторыі Воранаўшчыны. Арганізатарам яе быў А. А. Патапаў. Група распаўсюджвала лістоўкі, рыхтавалася да ўзброенай барацьбы, дапамагала хавацца збеглым з палону ваенна-служачым. Першапачаткова размяшчалася на хутары Навішча, потым вымушана была ісці ў лес. У гэты ж час былі ўтвораны і іншыя групы.

З мая 1942 г. пачалі дзейнічаць групы П. І. Асіпенкі, Р. Еўдакімава. Група Асіпенкі базіравалася каля хутара Каютава. Актывізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы садзейнічала ўтварэнне ў маі 1942 г. акруговага антыфашысцкага камітэта Баранавіцкай вобласці. Камітэт на чале з Г. М. Картухіным



Репозиторий ГрГМУ

аб'яднаў разрозненыя партызанскія і падпольныя групы ў Скідзельскім, Радунскім, Шчучынскім, Васілішкаўскім раёнах, арганізаваў работу па стварэнні новых груп і арганізацый для барацьбы з гітлераўцамі. Усе дзеючыя групы акруговы камітэт аб'яднаў у 5 баявых партызанскіх і 35 падпольных груп. У чэрвені 1942 г. з некалькіх партызанскіх груп камітэт арганізаваў атрад на чале з Г. М. Картухіным. Атраду было даручана ўстанавіць сувязь з ЦК КП(б)Б. У ліпені 1942 г. атрад рушыў у паход. Але па дарозе атрымаў новае заданне і накіраваўся ў Валынскую вобласць [1].

Больш актыўнымі і скаардынаванымі становяцца дзеянні партызан у 1942 г., калі стала відавочна, што ворага можна перамагчы. Змяніліся настроі і сярод мясцовага насельніцтва. Яно стала больш актыўна ўключацца ў барацьбу. Адначасова сталі ўзнікаць і падпольныя антыфашысцкія групы ў населеных пунктах.

Актыўнасць партызан, іх колькасць з кожным днём раслі. Таму ў адпаведнасці з рашэннем каманднага саставу груп і членаў антыфашысцкага камітэта 17.03.1943 быў арганізаваны атрад імя Ленінскага камсамола. У ім налічвалася прыкладна 160 чалавек. У склад атрада ўвайшлі многія падпольшчыкі. Так у сакавіку 1943 г. ў партызанскі атрад імя Ленінскага камсамола ўвайшла група Еўдакімава. І. Р. Еўдакімаў быў прызначаны начальнікам разведкі атрада. Колькасць партызан хутка расла. Адчуваўся недахоп зброі. Праз сувязнога Іосіфа Богдана была ўстаноўлена сувязь з начальнікам паліцыі Радунскага раёна Насовічам, які пагадзіўся дапамагаць партызанам і пастаўляць ім зброю. Некаторы час ён аказваў дапамогу, пастаўляў зброю, даваў інфармацыю аб планах гітлераўцаў, аднак вясной 1944 г. выйшаў з паліцыі і ўступіў у фарміраванні Арміі Краёвай.

У сувязі з хуткім ростам колькасці атрада імя Ленінскага камсамола ў адпаведнасці з рашэннем Радунскага падпольнага райкома КП(б)Б атрад быў разгорнуты ў брыгаду імя Ленінскага камсамола ў складзе атрадаў імя Г. І. Катоўскага і імя А. М. Матросава. Пазней былі створаны атрады «За Савецкую Беларусь». Да снежня 1943 г. брыгада ўваходзіла ў партызанскае злучэнне Лідскай зоны. Брыгада імя Ленінскага камсамола была



Рэпазіторый ГрДМУ

на той час даволі значнай сілай, добра ўзброенай і арганізаванай. Пасля стварэння ў верасні 1943 г. брыгады імя Ленінскага камсамола І. Р. Еўдакімаў быў прызначаны камандзірам атрада імя Катоўскага [2]. Менавіта ў гэты час назіраецца прыток у партызаны мясцовага насельніцтва. Вяскоўцы дапамагалі партызанам, адзявалі іх, кармілі, паведамлялі звесткі аб ворагу. У вёсках былі сувязныя, якія дапамагалі партызанам.

Партызаны актыўна дзейнічалі ў тыле ворага. Вось толькі некаторыя вытрымкі з баявога журнала брыгады імя Ленінскага камсамола:

28.06.1943 г. група партызан у складзе 46 чалавек пад кіраўніцтвам камандзіра групы лейтэнанта А. І. Іванова здзейсніла напад на нямецкі гарнізон у мястэчку Азёры. У выніку абстрэлу гарнізона забіты з жандары, разбіта паштова-тэлеграфнае аддзяленне, знішчана сувязь, узяты грошы і пішучая машынка.

У ноч з 23 на 24 жніўня 1942 г. групай партызан у складзе 5 чалавек пад кіраўніцтвам камандзіра групы І. Р. Еўдакімава разгромлены Яварская і Нацкая гміны (Радунскі раён), у выніку знішчаны ўсе дакументы і тэлефонная сувязь.

16.07.1942 г. група партызан пад кіраўніцтвам камандзіра групы І. Р. Еўдакімава ўзарвала чыгунку на ўчастку Араны-Алькінікі на лініі Гродна-Вільня, у выніку рух паяздоў затрыманы на 24 гадзіны.

15.10.1942 г. групай партызан у складзе 6 чалавек пад кіраўніцтвам І. Р. Еўдакімава разгромлена Валадарская гміна і маслазавод у Радунскім раёне [2].

І гэта толькі невялікі пералік дзеянняў і аперацый партызан брыгады. Як відаць, партызаны брыгады не абмяжоўваліся адміністрацыйнымі межамі Воранаўшчыны, а выходзілі далёка за межы сучаснага Воранаўскага раёна.

Актыўна дзейнічала камсамольская арганізацыя атрада імя Ленінскага камсамола. Райком камсамола аб'яднаў усе падпольныя арганізацыі, якія дзейнічалі ў вёсках. Была разгорнута работа сярод моладзі. Акрамя таго, у вёсках налічвалася 8 камсамольскіх арганізацый, якія аб'ядноўвалі каля 50 чалавек. Дзейнічала і партыйная арганізацыя. У чэрвені 1943 г. з партызанскім атрадам імя Ленінскага камсамола ўстанавіў сувязь Баранавіцкі падпольны абком КП(б)Б. Яго рашэннем у жніўні 1943 г. быў створаны Радунскі падпольны РК КП(б)Б.

Репозиторий ГрГМУ

Набліжалася доўгачаканае вызваленне. 11 ліпеня 1944 г. брыгада імя Ленінскага камсамола злучылася з часцямі Чырвонай Арміі.

Сёння па-рознаму ацэньваюць дзейнасць партызан. Нярэдка і негатыўна. Безумоўна, не абыходзілася і без перабольшванняў і самаўпраўства. Але ўсё ж гэтыя меры былі вымушаныя.Змагацца з ворагам у першыя дні вайны на Воранаўшчыне савецкім воінам давялося ў выключна неспрыяльных умовах, што не дазволіла спыніць яго прасоўванне. Але упартае супраціўленне, мужнасць і самаадданасць не былі дарэмныя. Нямецка-фашысцкія войскі гублялі жывую сілу і тэхніку, а таксама час. А кожнае іх знішчанае падраздзяленне, гармата, кожны падбіты танк, кожны выйграны дзень і нават час былі важкім укладам у справу мабілізацыі ўсёй краіны на адпор ворагу, на яго разгром. Менавіта мужныя дзеянні войск Чырвонай Арміі ўсялілі ў душы простых людзей надзею на тое, што ўсё ж які б не быў моцны вораг, як бы ён не запалохваў народ, але рана ці позна прыйдзе час вызвалення, час свабоды.

***Літаратура***

1. З гісторыі краю і лёсаў людзей Воранаўшчыны: матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, г.п. Радунь, 11 снежня 2004. – Радунь, 2004. – С. 185-188.

2. Памяць. Воранаўскі раён. – Мінск: Выд-ва «Беларуская энцыклапедыя», 2004. – С. 163-205.

***Гурбанов Фейруз Физулиевич***

## ДЖОЗЕФ МЕНГЕЛЕ-АНГЕЛ СМЕРТИ. УЖАСНЫЕ ЭКСПЕРИМЕНТЫ НАД БЛИЗНЕЦАМИ

УО «Гродненский государственный медицинский университет»
Военная кафедра

Научный руководитель – начальник учебной части – заместитель начальника военной кафедры, подполковник м/с Лескевич К.Л.

Джозеф Менгеле (1911-1979) – немецкий врач и нацистский военный преступник, избежавший правосудия после Второй мировой войны. Менгеле работал в печально известном лагере



Репозиторий ГрГМУ